ШКОЛЬНАЯ ПРАГРАМА

**Л. Э. Сенкевіч, М. К. Грыцэнка, Н. А. Дабравольская**

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## 3 клас

## *Практыкум*

*Дапаможнік для вучняў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання*

Мінск
«Сэр-Віт»
2026

## АД АЎТАРАЎ

***Шаноўны трэцякласнік!***

Рады прапанаваць табе дапаможнік для лепшага засваення пройдзеных тэм. Карыстаючыся ім, ты зможаш на пачатку кожнай тэмы паўтарыць патрэбнае правіла, папрацаваць над тэмай, а таксама праверыць узровень сваіх ведаў. Заданні вельмі цікавыя: скласці прыказкі, уставіць прапушчаныя літары, знайсці лішнія словы і г. д.

У дапаможніку шмат вершаў і тэкстаў знакамітых беларускіх паэтаў, пісьменнікаў. Чытай правілы, выконвай практыкаванні, вучыся гаварыць па-беларуску. Прапануюцца практыкаванні для адпрацоўкі арфаграфічных навыкаў, шмат матэрыялу для развіцця маўлення і пашырэння лексічнага запасу. Каб праверыць трываласць набытых ведаў, выконвай заданні пад рубрыкай «Правер сябе».

***Поспехаў табе, дружа, у вывучэнні роднай мовы.***

# ПАЎТАРЭННЕ ВЫВУЧАНАГА Ў 2-М КЛАСЕ

***Памятка!*** Словы пераносяцца з аднаго радка на другі па складах: *ха-кей, сня-жын-ка*. Склад з адной літары нельга пакідаць на радку ці пераносіць на новы радок: *за-вея, ела-чка, іней*.

Літары **й, ў, ь** пры пераносе не аддзяляюцца ад папярэдняй літары: *заў-тра, лей-ка, паль-чык*.

Спалучэнні літар **дз** і **дж**, якія абазначаюць гукі [дз'] і [дж], пры пераносе слоў не раздзяляюцца: *ура-джай, вя-дзер-ца, суд-дзя.*

Словы з падоўжанымі зычнымі можна пераносіць так: *заціш-ша, зацi-шша, збож-жа, збо-жжа.*

**1.** Падзялі вертыкальнай рыскай словы для пераносу.

Узвышша, гадзіна, пісьмо, ураджай, чайнік, пад'ём, вяселле, паштальён, галоўка, стагоддзе, слоўнік, пячэнне, дажджавыя, заўтра, канькі, байка.

***Памятка!*** У беларускай мове літары ***о, э*** пішуцца ў націскных складах.
У ненаціскных складах замест іх пішацца ***а***:
*го́рка – гара́, трэ́ск – трашчы́ць.*

**2.** Устаў літары ***о***, ***э*** ці ***а***:

Р..дны, к..рміць, шч..бет, с..рдэчны, к..́сы, ш..ры, ш..пт, р..чка, к..л..сок, тр..шча́ла, ш..рань, тр..скатня́, н..чаваць, р..кі, д..жджык, п..ляўнічы, пч..ліныя, г..сцінец, шч..бятуха.

**3.** Выпраў памылкі. Карыстайся правілам.

Во́зеро, прыго́рак, хо́лод, ночава́ць, маўклі́вы, хвоста́ты, рэка́, водзяны́, нора́, цэгля́ная.



***Памятка!*** У першым складзе перад націскам замест літар ***е, ё*** пішацца ***я:***
*сёлы – сяло́, серп – сярпо́к, смех – смяшы́ць.*

У другім, трэцім і іншых складах перад націскам пішацца ***е***: *пе-ра-мо́-га, лес-ні-чо́ў-ка, ве-ся-ло́сць.*

У першым складзе пасля націску пішацца ***е***: *ве́-цер, ка-ло́-дзеж, во́-сень.*

**4.** Устаў літары ***е***, ***ё*** ці ***я***.

Кроп..лька, в..с..лушка, сн..гір, в..снавы, дз..нёчкі, сн..гіры, ц..ц..рукі, в..сёлка, ліп..нь, сн..гавік, з..мелька, в..сенні, з..мля, з..л..ніна, б..розавы, гл..дачы, пал..ўнічы, вул..й, л..дз..ная, в..лікі, св..тло, п..вень.

***Памятка!*** Апостраф пішацца пасля літар, якія абазначаюць цвёрдыя зычныя гукі, перад літарамі **е**, ***ё***, ***ю***, ***я***, ***і***, калі паміж зычным і галосным вымаўляецца

[й’э] [й’у] [й’а] [й’і]

гук [й’]: *надвор’е, п’ю, аб’ява, вераб’і.*

Апостраф не пішацца пасля літары ***ў*** (у нескладовае):

[й’і] [й’э]

*салаўі*, *здароўе*.

***Памятка!*** Раздзяляльны мяккі знак пішацца пасля літар ***л***, ***н***, ***з***, ***с***, ***ц***, якія абазначаюць мяккія гукі, і спалучэння літар ***дз*** перад **е**, ***ё***, ***ю***, ***я***, ***і***: ***лье****цца, Арсе**нье**ў, Афана**сье**ў, пар**цье́**ры, Арка**дзье**ў.*

**5.** Прачытай сказ. Назаві першы зычны гук у кожным слове.

У цёплы летні дзень Ніна збірала сена.

[ц’] [л’] [дз’] [н’] [з’] [с’]

✶ ***Запомні сказ.*** Гэта дапаможа табе ўспомніць, пасля якіх мяккіх зычных пішацца раздзяляльны мяккі знак.

**6.** Устаў ***ь*** ці ***апостраф***.

Іл..я, пашталь..ён, пад..ём, узмор..е, шампін..ён, аб..ём, сузор..е, Мар..ян, п..яўкі, грыл..яж, Аркадз..еўна, парц..ера, пал..е, надвор..е, сям..я, Лук..ян, сур..ёзная, Афанас..еўна, Дар..я.

✶ Растлумач правапіс літар, якія ты выбраў.

***Успомні!***

1. Літара ***ў*** пішацца пасля галосных: *ласта**ў**ка, шча**ў**е, дзя**ў**чынка.*
2. Пасля знакаў прыпынку пішацца звычайная літара ***у***: *Заглянула восень у лясы, **у** сады, на палі і агароды.*
3. Не бывае вялікай літары ***ў***: *Сёння ў школу **У**ладзік прынёс новы сшытак.*

**7.** Закрэслі ў дужках лішнюю літару.

(У, Ў) гэтым л(е, я)сочку многа гр(і, ы)бо(ў, у). На старых пнях апенькі ж(а, о)(у, ў)цею(т, ц)ь. Пад б(е,я)розамі с(е, я)(д, дз)я(т, ц)ь падб(е, я)розавікі. У мох залезлі м(а, о)хавікі.

***Памятка!*** Парныя зычныя на канцы слоў і ў сярэдзіне слоў перад зычнымі трэба правяраць. Для праверкі трэба змяніць слова так, каб пасля зычнага стаяў галосны гук: *голуб – галубок, сцежка – сцежачка, зубкі – зубы.*

**8.** Выберы адну з літар у дужках. Запішы праверачныя словы.

Гры(б/п)кі – ____________________

ры(б/п)кі – ____________________

жа(б, п)кі – ____________________

лы(ж, ш)кі – ____________________

ву(ж, ш)кі – ____________________

ко(з, с)кі – ____________________

ра(д, т)кі – ____________________

са(д, т)кі – ____________________

## ***Правер сябе***

**1.** Які раздзяляльны знак трэба пісаць пасля гукаў [ц’], [л’], [дз’], [н’], [з’], [с’] перад ***е, ё, ю, я, і***? Адзнач «✓».

☐ Апостраф; ☐ мяккі знак.

**2.** Адзнач «✓» правільна падабраныя праверачныя словы.

Горад – ☐ гарады, ☐ гарадскі, ☐ гарадок.

Вёска – ☐ вёскі, ☐ вёсачка.

Луг – ☐ лужок, ☐ лугі.

**3.** Адзнач «✓», якія словы перанесены правільна.

- [ ] Га-ллё;
- [ ] малад-зік;
- [ ] ел-ьнік;
- [ ] сямей-ка.

**4.** Якія словы трэба пісаць з літарай ***а***? Адзнач «✓».

- [ ] П..ле;
- [ ] з..латы;
- [ ] ц..гла;
- [ ] ш..птаць;
- [ ] з..лата;
- [ ] п..лявы.

**5.** Устаў прапушчаныя літары. У якіх радках правільна падкрэслена лішняе слова? Адзнач «✓».

- [ ] У лістапа..е, <u>нярэ..ка</u>, ..яцел, ха..ілі.
- [ ] Надвор..е, <u>кап..ё</u>, перал..е, сям..я, вераб..і.
- [ ] Нев..лічкая, <u>сон..чны</u>, сн..жынка, з..лёны.

# ЗМЕСТ

**Ад аўтараў** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

**Паўтарэнне вывучанага ў 2-м класе** . . . . . . . . . . . 4

**Тэкст** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 10
Прыметы тэксту . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 10
План тэксту . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 15

**Сказ** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 22
Прыметы сказа. Тыпы сказаў . . . . . . . . . . . . . . 22
Апавядальныя сказы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 25
Пытальныя сказы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27
Пабуджальныя сказы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 31
Клічныя сказы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 34
Галоўныя і даданыя члены сказа. Дзейнік
і выказнік – галоўныя члены сказа . . . . . . . . . 38
Даданыя члены сказа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40

**Слова. Значэнне слова** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 43
Адназначныя і мнагазначныя словы . . . . . . . . 43
Прамое і пераноснае значэнне слова . . . . . . . . 46
Сінонімы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49
Антонімы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 51
Словы, аднолькавыя па гучанні,
розныя па значэнні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 53

**Склад слова** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 58
Роднасныя (аднакаранёвыя) словы.
Корань слова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 58
Чаргаванне гукаў у корані слова . . . . . . . . . . . 61
Формы слова. Канчатак . . . . . . . . . . . . . . . . . . 64

Прыстаўка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 68
Суфікс . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 73

**Часціны мовы** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 79
Назоўнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 79
Адзіночны і множны лік назоўнікаў . . . . . . . . . . . 82
Род назоўнікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 86
Прыметнік. Змяненне прыметнікаў па родах . . . . . 92
Змяненне прыметнікаў па ліках . . . . . . . . . . . . . . 97
Дзеяслоў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 101
Адзіночны і множны лік дзеясловаў . . . . . . . . . . . 105
Час дзеясловаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 109
Змяненне дзеясловаў прошлага часу
па родах . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 114
Правапіс ***не*** з дзеясловамі . . . . . . . . . . . . . . . . 119

**Паўтарэнне** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 123

**Спіс выкарыстаных крыніц** . . . . . . . . . . . . . . . . . 130